# *Гісторыя і тэорыя беларускага музычнага мастацтва*

УДК 78.072.3(476)

**В. У. Дадзіёмава**

## МУЗЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ: КАРОТКІ АГЛЯД КРЫНІЦ



***Дадзіёмава Вольга Уладзіміраўна** — загадчык кафедры беларускай музыкі УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», доктар мастацтвазнаўства, прафесар*

*Анатацыя.* У артыкуле разгледжаны помнікі музычна-тэарэтычнай, гістарычнай і педагагічнай думкі Беларусі XIX ст. і пазначаны асноўныя падыходы да іх далейшага вывучэння.

Адной з важнейшых праяў музычнай культуры розных эпох і народаў з'яўляецца сукупнасць навуковых і метадычных, этнамузыкалагічных і музычна-эстэтычных, крытычных і публіцыстычных тэкстаў, што абагульняюцца паняццем «музычная думка». Як гістарычны феномен, трактаваны ў катэгарыяльным сэнсе, музычная думка ўвасабляе працэс самарэфлексіі, самапазнання культуры, а значыць — захавання і развіцця яе ў прасторы і часе.

Не паглыбляючыся ў спецыяльную праблему змястоўнай сутнасці дадзенага сегмента музычна-культурнай сістэмы і яго разгорту ў шырокім хранатопе, адзначым, што некаторыя помнікі музычнай думкі Беларусі мінулых эпох (да XX ст.) ужо прыцягвалі ўвагу беларускіх даследчыкаў, аднак у цэлым дадзеная праблема яшчэ не станавілася прадметам спецыяльнага разгляду. Зрэшты, мы таксама не маем на мэце аналіз помнікаў, што рэпрэзентуюць гісторыю айчыннай музычнай думкі, а імкнёмся здзейсніць толькі іх кароткі агляд — дзеля прыцягнення ўвагі да заяўленай тэмы і далейшай яе распрацоўкі.

У дадзеным выпадку мы спыняемся на тэкстах, прысвечаных пісьмовым формам музычнага мастацтва, пакідаючы ўбаку этнамузыкалагічныя распрацоўкі, што складаюць змест асобай галіны ведаў і дэталёва прааналізаваны ў калектыўнай працы «Беларуская этнамузыкалогія» [1]. Мы таксама не бяром у разгляд раскіданыя ў беларускай мастацкай літаратуры, слоўніках, мемуарах і эпісталярыях ўзгадкі пра музыку, якія маюць фрагментарны характар. Нас цікавяць перадусім тыя працы, што былі створаны на Беларусі і па-за межамі краіны айчыннымі музыкантамі.

Пры такім падыходзе ў кола крыніц нашага даследавання ўцягваюцца крыніцы, выдадзеныя ў Вільні, Варшаве і Пецярбургу, г. зн. у сталіцах тых краін (Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай Імперыі), у межы якіх калісьці ўваходзіла Беларусь. Усведамляючы, што ўсе дадзеныя помнікі з'яўляюцца здабыткам некалькіх культур і народаў, мы адносім іх і да гісторыі айчыннай культуры, паколькі іх аўтары нарадзіліся ці пэўны час працавалі ў Беларусі, аказаўшы сваёй кампазітарскай і педагагічнай дзейнасцю значны ўплыў на развіццё айчыннага музычнага мастацтва.

Зразумела, мы лічым навукова некарэктным разгляд такіх крыніц у кантэксце станаўлення беларускай нацыянальнай музыкалагічнай школы, росквіт якой стаўся, як вядома, дасягненнем і здабыткам XX ст. [2]. Больш за тое: у спецыфічных гісторыка-культурных умовах, у якіх разгортваўся айчынны мастацкі працэс, працы папярэднікаў сучасных даследчыкаў не толькі не маглі стаць для апошніх крыніцай ведаў, але ўвогуле заставаліся недаступнымі — і ў фізічным (бо ўсе крыніцы захоўваюцца па-за межамі Беларусі), і ў метафізічным, ментальным сэнсе. Невядомымі з-за таго глыбокага разлому эпох, што на доўгі час адарваў XX ст. ад усяго папярэдняга перыяду і спарадзіў вымушанае забыццё мінулага.

Сёння ж, калі ажыццяўляецца даследаванне ўсіх этапаў гісторыі айчыннай музычнай культуры, стала відавочна, што музычная думка Беларусі вядзе свой радавод з глыбіні вякоў, са старажытных летапісаў, хронік ды казанняў эпохі Сярэднявечча, доўжыцца ў тэкстах часоў Рэнесансу (выказванні Ф. Скарыны), Барока (працы Ж. Ляўксміна,

Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"

М. Дылецкага, А. Мезенца і г. д.), Класіцызму (падручнікі А. Варанца і Я. Голанда ды інш.). У сваёй большасці ўзгаданыя помнікі, якім яшчэ будзе прысвечана наша спецыяльная праца, маюць музычна-педагагічную скіраванасць і практычнае прызначэнне. У адрозненне ад іх узоры музычнай думкі XIX ст. маюць больш шырокае змястоўнае поле: гэта не толькі падручнікі і самавучыцелі, але і музычна-гістарычныя ды тэарэтычныя працы, якія абгрунтоўваюць і адлюстроўваюць, падрыхтоўваюць і ахоўваюць музыкатворчы працэс, узыходзячы да вяршынь эстэтычных абагульненняў і спускаючыся ў даліны вузкапрафесійных праблем.

Асноўны корпус тэкстаў належыць аўтарам, якія нарадзіліся і выхоўваліся на Беларусі. Аднак большасць іх прац застаюцца пераважна польскамоўнымі, як і многія ўласна літаратурныя творы тагачаснай Беларусі, што дэ-юрэ ўжо амаль стагоддзе была далучана да Расіі, а дэ-факта ўсё яшчэ існавала ў інтэлектуальных традыцыях ВКЛ. Спадкаемцам гэтых традыцый заставалася мясцовая інтэлігенцыя, з колаў якой і паходзяць аўтары большасці выданняў — Напалеон Орда, Станіслаў Манюшка, Міхал Агінскі, Ян Карловіч, Міхал Ельскі і інш.

Нагадаем, што ў Заходняй Еўропе той час адзначаны з'яўленнем фундаментальных даследаванняў па праблемах кампазіцыі, гармоніі і формы, класічных работ А. Маркса, Я. Вэбэра, Г. Рымана, Ф. Феціса, А. Бландо, А. Амброза, Л. Кёхеля і інш. У Расіі выходзяць працы А. Львова і Г. Лароша, П. Чайкоўскага і М. Рымскага-Корсакава, Г. Конюса і М. Іпалітава-Іванава. У Польшчы музычная думка прадстаўлена работамі Ю. Эльснера, М. Сужынскага, К. Курпінскага, А. Хыбінскага, А. Савінскага, А. Фрэера, А. Сімана і інш. Істотна, што ў той час паўсюдна ствараюцца шматлікія падручнікі, якія маюць на мэце спрасціць складанае вучэнне і выкласці яго папулярна для пачаткоўцаў ды аматараў музыкі. Толькі ў Францыі — гэта выданні П. Бьенамэ, М. Эслава, П. Клузэ, Г. Лефера, Л. Допра і інш.




У Парыжы ў 1830-я–1850-я гады працаваў і ўраджэнец Беларусі, вядомы кампазітар, піяніст і мастак Напалеон Орда (гл. фота 1). Ён таксама далучыўся да музычна-папулярызатарскага руху, адрасаваўшы музыкантам-аматарам не толькі свае музычныя творы, але і самавучыцель ігры на фартэпіяна («Граматыка музыкі, альбо Аналітычны і практычны выклад мелодыі і гармоніі з кароткім дадаткам аб фузе, кантрапункце, аркестровых інструментах, аб аргане, фартэпіяна і навуцы спеваў для выкарыстання піяністаў»), напісаны ў 1861 г. (гэтая дата пазначана ў прадмове да выдання) і надрукаваны ў 1873 г.


STANISŁAWOWI MONIUSZCE,

W DOWÓD CZCI I JEGO ZASŁUGOM MUZYCZNYM

GRAMATYKA MUZYKI

CZYLI

MELODYI i HARMONII

o fudze, kontrapunkcie, instrumentach orkiestrowych, o organie, fortepianie i o nauce śpiewu,

DLA UŻYTKU PIANISTÓW

NAPOLEONA ORDĘ

WARSZAWA.

W DRUKARNI JANA JAWORSKIEGO

1873.

Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"

У 22 лекцыях падручніка пададзены асновы тэорыі музыкі, гармоніі, аналізу формы і інструментазнаўства. Нельга сказаць, што матэрыял выкладаецца сістэматычна і паслядоўна, аднак для практычных патрэб такі спосаб яго падачы ўяўляецца даволі арганічным: у працэсе асваення лекцый кожны піяніст-аматар набывае неабходныя веды і навыкі для самастойных заняткаў на фартэпіяна.

Аўтарам наступнай методыка-педагагічнай працы з'яўляецца Станіслаў Манюшка — вядомы кампазітар і музычны дзеяч, які паходзіў з Беларусі і шмат гадоў жыў на беларускай зямлі.


PAMIĘTNIK
do nauki
Harmonii
wykładu
Stanisława Moniuszki.
Cena Rs 1.20
WARSZAWA
NAKŁAD FERDYNANDA HÖSICK
Przy ulicy Senatorskiej №496.

Падручнік С. Манюшкі [3], як і Н. Орды, відавочна, быў выкліканы да жыцця патрэбамі аматараў музыкі і навучэнцаў у даступных дапаможніках. Аднак тэарэтычны падмурак для сваёй працы аўтар абраў вельмі грунтоўны: ён абапіраўся на класічныя нямецкія выданні па гармоніі, перш за ўсё А. Маркса і Э. Рыхтэра. Шмат агульнага назіраецца ў падручніках Манюшкі і П. Чайкоўскага (яны былі выдадзены амаль адначасова, адпаведна ў 1871 і 1872 гг.). Думаецца, падабенства дзвюх прац невыпадковае, паколькі П. Чайкоўскі — вучань Н. Зарэмбы (які, у сваю чаргу, вучыўся ў А. Маркса) — таксама быў паслядоўнікам нямецкай музычна-тэарэтычнай школы.

Калі падручнік С. Манюшкі атрымаў шырокі розгалас, дык яго дапаможнік па нотнай грамаце («Школа чытання музыкі для навучэнцаў на розных інструментах, якія карыстаюцца скрыпічным і басовым ключом») застаўся ў рукапісе, што захоўваецца ў Варшаўскім музычным таварыстве (№ 764). Складзеная з 14 параграфаў, праца ўтрымлівае больш за 300 практыкаванняў, найбольш карысных для авалодання навыкамі ігры на фартэпіяна [4, с. 740]. Маецца яшчэ адна рукапісная праца С. Манюшкі, а менавіта «Нататкі пра касцельную музыку», што захоўваецца ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя М. Салтыкова-Шчадрына (Збор Ваксэля, 366). Яна мае хутчэй не метадычнае, а музычна-выхаваўчае значэнне, паколькі акрэслівае стан сучаснай аўтару касцельнай музыкі і прадстаўляе план стварэння шэрагу рэлігійных кампазіцый [5]. Несумненна, распрацоўкі С. Манюшкі вартыя таго, каб стаць прадметам спецыяльных даследаванняў.

Падобную значнасць маюць і выданні іншага ўраджэнца Беларусі, знаўцы і даследчыка беларускай мовы і фальклору, музычнага дзеяча, выканаўцы і кампазітара Яна Карловіча (бацькі вядомага польскага кампазітара Мячыслава Карловіча). Ян пераклаў работу Э. Рыхтэра «Асновы гармоніі», «Падручнік па музычнай кампазіцыі» Й. Лобе, а таксама стварыў арыгінальную працу — «Праект новага музычнага пісьма», якая з'яўляецца адзіным узорам даследавання айчынных аўтараў у галіне музычнай палеаграфіі. «Праект» Я. Карловіча быў выдадзены ў Варшаве тройчы — на англійскай (1876), французскай (1878) і польскай (1892) мовах [6], аднак шырокага распаўсюджання ён не атрымаў, паколькі яго прынцыпы аказаліся шмат у чым штучнымі. І ўсё ж немагчыма ўявіць, што Ян Карловіч, рознабакова адукаваны інтэлектуал, выхаванец Маскоўскага, Гейдэльбергскага, Берлінскага ўніверсітэтаў, Парыжскай і Брусельскай кансерваторый, мог стварыць утапічны праект. Ён сапраўды пераканаўча даказвае недасканаласць пяцілінейнага нотнага запісу для хуткага чытання нот і прапаноўвае замяніць яго лічбавым і літарным. Рэанімірыруючы і мадэрнізуючы прынцыпы старажытнай палеаграфіі, табулатурныя запісы часоў Рэнесансу, а таксама ідэі Ж.-Ж. Русо, аўтар не толькі стварае новыя правілы запісу музыкі, але і даказвае іх жыццядзейнасць і практычную значнасць, «перакладаючы» на новую музычную пісьменнасць Прэлюдыю Ф. Шапэна сі мінор ор. 28 № 6. Безумоўна, першы ў гісторыі вопыт «транслітарацыі» шапэнаўскай творчасці, як і рэформы музычнага пісьма ў цэлым, аказаўся далёкім ад шырокага практычнага выкарыстання, але ў цэлым захады Яна Карловіча ў дадзенай сферы не могуць не зацікавіць сучасных даследчыкаў.

Як адзначалася, музычна-педагагічныя і тэарэтычныя распрацоўкі, што маюць дачыненне да гісторыі айчыннай культуры, выходзілі ў той час не толькі ў Варшаве, але і ў Вільні. З іх вылучаюцца падручнікі ігры на аргане Я. Галіча-Сулінскага, Я. Салецкага і Ю. Грыма, якія адлюстроўваюць працэс уздыму цэцыліянскага руху ў галіне касцельнай музыкі [7, с. 114].

Відавочна, такім чынам, што ў XIX ст. тэарэтычна-педагагічная галіна музычнай думкі Беларусі была прадстаўлена шырокім колам выданняў — ад самавучыцеляў і падручнікаў нотнай граматы да даследаванняў па тэорыі музыкі.

Не менш разнайстайнай была і музычна-эстэтычная, гістарычная і публіцыстычная сфера, прадстаўленая працамі Міхала Клеафаса Агінскага [гл. аб гэтым:8], Гераніма Памарнацкага [9, с. 46–47; 10], Аляксандра Валіцкага [11], Фларыяна Міладоўскага [12] і Міхала Ельскага [13]. Знаёмства з гэтымі работамі, фактаграфічна насычанымі, поўнымі трапных назіранняў і глыбокіх меркаванняў, пераконвае ў тым, што яны маюць вялікую пазнавальную каштоўнасць і

Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"




Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"

вартыя далейшага вывучэння як крыніцы інфармацыі аб айчыннай і агульнаеўрапейскай музычнай культуры. Дапаўняюць уяўленні аб гэтай культуры і некаторыя іншыя помнікі, якія належаць пяру літаратараў і музыкантаў-аматараў [8, с. 72–75].

У шэрагу крыніц, якія адкрываюць старонкі гісторыі айчыннага мастацтва, маюцца тэксты, доступ да якіх пакуль немагчымы: гэта метадычная праца Восіпа Казлоўскага («Теоретическая и практическая метода для фортепиано, изданная г-м Козловским»), што выйшла на французскай і польскай мовах [14, с. 41], «Школа ігры на фартэпіяна», якую пачаў стварацць А. Абрамовіч у 1846 г. [15, с. 55] і музычна-педагагічныя распрацоўкі Райнольда Тызенгаўза [16]. Нарэшце, у аддзеле рукапісаў Бібліятэкі АН Літвы (F151, 1104) захоўваецца «Азбука гармоніі» («Harmonijne abecadło») Тамаша Зана, ксеракопія якой, ласкава перададзеная нам У. Конанам, аказалася, на жаль, нечытабельнай.

У цэлым, думаецца, нават кароткі агляд некаторых крыніц па акрэсленай праблеме паказвае, што музычная думка Беларусі XIX ст. ахоплівае вельмі розныя па змесце, накіраванасці і прафесійным узроўні працы. Аднак на цяперашнім, першапачатковым этапе даследаванняў на першы план выходзяць не столькі іх аксіялагічныя якасці, колькі пазнавальная каштоўнасць — як артэфактаў, што, падобна археалагічным знаходкам, з’яўляюцца самакаштоўнымі, бо служаць доказам існавання раней схаванага ад позірку даследчыкаў музычна-гістарычнага ландшафту, сведчаннем багацця яго зместу і праяў. Сёння першачарговай задачай уяўляецца

«антыпрыярытэтны» (па тэрміналогіі Ю. Лотмана), крыніцазнаўча-тэксталагічны разгляд усіх тэкстаў — дзеля адкрыцця шляху да іх комплекснага, усебаковага, у тым ліку і кантэкстуальнага, аналізу. А паколькі ўсе ўзгаданыя помнікі з'яўляюцца непадзельнай спадчынай некалькіх народаў ды культур, іх далейшае вывучэнне, а таксама пошук новых матэрыялаў па тэме мае прынцыповае значэнне для навуковай рэканструкцыі гісторыі не толькі айчыннай, але і агульнаеўрапейскай музычнай культуры.

***Літаратура:***


1. Белорусская этномузыкология. Очерки истории (XIX –XX вв.). — Минск, 1997.
2. *Дулова, Е.* Научные школы современного отечественного музыкознания в контексте истории культуры / Е. Дулова // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклarыстыкі : у 2 ч. — Ч. 2. — Мінск : Беларус. навука, 2007. — С. 222–236.
3. *Moniuszko, St.* Pamiętnik do Nauki Harmonii / St. Moniuszko. — W-wa, 1873.
4. *Rudziński, W.* Studia i materiały / W. Rudziński. — Cz. II. — Kraków : PWM, 1961.
5. *Nowaczyk, E.* Wstęp / E. Nowaczyk // Pieśni sołowe i duety z organami lub orkiestrą : opracowania organowe śpiewów religijnych / S. Moniuszko. — Kraków, 1974. — T. 6. — S. 1–14.
6. Project of a new way of writing musical notes / by Johan Karłowicz. — Warsaw, 1876; Project d'une nouvelle notation musicale par Jan Karłowicz. — Varsovie, 1878; *Karłowicz, Jan.* Projekt nowego piśma muzycznego / Jan Karłowicz // Echo Muzyczne, Teatralne i Artystyczne. — 1892. — N 442. — S. 135–137; N 443. — S. 150–151; N 444. — S. 162; N 445. — S. 183–184.
7. *Шэйпа, С.* «Школа для аргана» 1881 г. Юзафа Грыма — віленскага музыканта другой паловы XIX стагоддзя / С. Шэйпа // Старонкі гісторыі беларускай музыкі. — Мінск, 2005.
8. *Немагай, С.* Жыццё і творчасць М. К. Агінскага ў каардынатах яго часу і культурнага асяроддзя / С. Немагай. — Мінск, 2007.
9. *Капилов, А.* Скрипка белорусская / А. Капилов. — Минск, 1982.
10. Rozprawa o muzyce i skrzypcach przez Hieronima Pomarnackiego. — Wilno : W drukarni A. Marginowskiego, 1835.
11. *Żeleźniak,* A. Gubernia Mińska pod względem muzycznym / A. Żeleźniak // Ruch muzyczny. — 1858. — N 48. — S. 387–415.
12. *Miładowski, F.* Korrespondencya / F. Miładowski // Ruch muzyczny. — 1857. — N 18. — S. 138–139; *Miładowski, F.* Arkusz słów o postępie muzykalnym / F. Miładowski // Ruch muzyczny. — 1858. — T. 2. — N 40. — S. 313–315; *Miładowski, F.* Jeszcze o sprawie muzyki / F. Miładowski // Ruch muzyczny. — 1860. — T. 4. — N 2. — S. 22–24; *Miladowski, F.* Korrespondencya: pp. Kahle i symfonyum Pauza / F. Miładowski // Ruch muzyczny. — 1860. — T. 4. — N 45. — S. 726–728.
13. *Назина, И.* Становление и развитие белорусского инструментоведения как специальной научной дисциплины / И. Назина // Белорусская этномузыкология : очерки истории (XIX–XX вв.). — Минск, 1997. — С. 223–224; *Сапранкова, А.* Міхал Ельскі як даследчык музычнага мастацтва Беларусі / А. Сапранкова // Мастацтва. — 2000. — № 9. — С. 40–41; *яе ж.* «Народныя танцы Мінскай губерніі» М. Ельскага як помнік харэаграфічна-інструментальнай культуры Беларусі другой паловы XIX стагоддзя // Беларускае музыказнаўства–2000 : матэрыялы IX Навук. чыт. памяці Л.С. Мухарынскай (1906–1987). — Мінск, 2000. — С. 84–91; *яе ж.* З музычна-публіцыстычнай спадчыны М. Ельскага // Музычная культура Беларусі: Гістарычны шлях. Кантакты : матэрыялы X Навук. чыт. памяці Л. С. Мухарынскай (1906–1987). — Мінск, 2002. — С. 71–74.
14. *Соколова, А. М.* Композитор Осип Антонович Козловский / А. М. Соколова. — М., 1997. — С. 41.
15. *Капилов, А. Л.* Музыкальная культура Беларуси XIX — начала XX веков / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. — Минск, 2000. — С. 55.
16. *Зямчонак, І.* Райнольд Тызенгаўз аб музычнай адукацыі ў 2-й палове XIX стагоддзя / І. Зямчонак // Беларускае музыказнаўства — 2000 : матэрыялы IX Навук. чыт. памяці Л.С. Мухарынскай (1906–1987). — Мінск, 2000. — С. 80–84.


***Summary.*** In this article the old relics and monuments of musical, theoretical, historical and pedagogical conception in Belarus of 19th century were described and the main methods of approach for its further exploration were determined.

Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"